**В.А.Касап,** *дацэнт*

# НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ І ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДАКУМЕНТАЛОГІІ І ГІСТОРЫІ КНІГІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыярытэтнымі задачамі развіцця вышэйшай адукацыі на сучасным этапе, як адзначана ў Праграме развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі на 2006–2010 гг., з'яўляюцца павышэнне якасці падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў, удасканаленне зместу і тэхналогій навучання; забеспячэнне вучэбна-метадычнага суправаджэння падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасці са стандартамі новага пакалення, актуалізацыя зместу навучання, выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій і кадравае забеспячэнне вучэбнага працэсу. Паспяховая рэалізацыя пастаўленых задач магчыма пры ўліку зместу падрыхтоўкі, інфармацыйна-метадычнага забеспячэння адукацыйнай дзейнасці студэнта, пэўным узроўні матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння вучэбнай дзейнасці, высокай кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу, выкарыстанне новых педагагічных тэхналогій у вучэбным працэсе і інш. Такім чынам, звяртаецца ўвага на прыярытэт павышэння якасці ўсіх напрамкаў вучэбна-метадычнай дзейнасці, што становіцца надзвычай актуальным у сувязі з прыняццем дзяржаўнай праграмы "Якасць", рэалізацыя якой запланавана на 2007–2010 гг.

Адной з важных складаючых якасці вучэбнага працэсу, эфектыўнага ўзаемадзеяння выкладчыка і студэнта з'яўляецца яго навукова-метадычнае і інфармацыйнае забеспячэнне, у прыватнасці забяспечанасць вучэбнага працэсу вучэбна-метадычнымі матэрыяламі, наяўнасць такой інфармацыі ў лакальнай сетцы універсітэта і ў Інтэрнеце, ацэнка якасці вучэбна-метадычных матэрыялаў. У ліку гэтых матэрыялаў павінны быць вучэбна-метадычныя матэрыялы, арыентаваныя на самастойную работу, забяспечанасць імі бібліятэкі і вучэбных лабараторый. У ВНУ павінны быць умовы для стварэння вучэбных дапаможнікаў з выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій [1].

Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў забяспечвае фундаментальныя аспекты падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай адукацыі першай і

другой ступеней навучання. Студэнты вывучаюць тэарэтычныя і гістарычныя дысцыпліны інфармацыйна-дакументнага кірунку падрыхтоўкі кадраў. Курсы "Дакументалогія" і "Гісторыя кнігі" садзейнічаюць фарміраванню ведаў аб відах і ўласцівасцях дакументаў, гісторыі іх з'яўлення, спосабах і метадах стварэння, гістарычных умовах узнікнення пісьма, пісьменнасці і кнігі. Пры вывучэнні матэрыялаў гэтых дысцыплін навучэнцы атрымліваюць звесткі аб найбольш значных помніках сусветнай кніжнай культуры. Матэрыял курсаў дапамагае засвоіць веды па вызначэнні найбольш каштоўных дакументаў для пэўных груп карыстальнікаў, эфектыўнага выкарыстання даведачнага апарату дакументаў і інш.

Зараз адбываецца перамяшчэнне акцэнтаў з фарміравання ведаў на развіццё здольнасцей студэнта актыўна ўключацца ў практычную дзейнасць, набываць у час навучання ўменні і навыкі хуткай адаптацыі ў прафесійным асяроддзі. Дысцыпліны дакументазнаўчага цыкла складаюць падмурак будучай практычнай дзейнасці студэнта. Выкладанне гэтых дысцыплін забяспечваецца неабходнымі вучэбна-метадычнымі матэрыяламі: тыпавымі праграмамі, вучэбна-метадычнымі комплексамі (ВМК), пабудаванымі па адзінай методыцы. У працэсе ўкаранення сістэм кіравання якасцю вучэбнага працэсу менавіта ВМК становяцца паказчыкам узроўню прафесійнай культуры выкладчыка і канкурэнтаздольнасці дысцыпліны. ВМК у поўнай меры могуць забяспечыць не толькі сам адукацыйны працэс, але і эфектыўную самастойную работу студэнтаў. Яны функцыянуюць праз непарыўна звязаныя паміж сабой кампаненты, распрацаваныя на адзіных навуковых падставах і логіцы сучасных тэхналогій навучання, якія паэтапна праз вучэбныя сітуацыі забяспечваюць асэнсаваную і прадуктыўную дзейнасць студэнтаў, а таксама кіруючую дзейнасць выкладчыка з мэтай дасягнення педагагічнага эфекту.

Удасканаленне ВМК і вучэбнага працэсу ў цэлым – гэта пастаянная дзейнасць кафедры з мэтай больш актыўнай дапамогі студэнтам у засваенні дысцыплін. Так, пастаянна аднаўляюцца тэматыка і формы правядзення семінарскіх і практычных заняткаў, літаратура да іх. Па дысцыплінах дакументазнаўчага цыкла праводзяцца семінары-дыспуты, семінары-рынгі, "круглыя сталы" і інш. Доступ да ВМК адбываецца праз матэрыялы, размешчаныя ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кабінеце кафедры ў папяровым і электронным варыянтах, а таксама і праз электронную бібліятэку ўніверсітэта. У ВМК змяшчаюцца тэксты лекцый-канспектаў па курсе “Дакументалогія”, рэйтынгавыя рэгламенты па дысцыплінах, планы прэзентацый, падрыхтаваных выкладчыкамі і студэнтамі па асобных раздзелах і тэмах курсаў. Безумоўна, галоўнай крыніцай засваення любой вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца падручнік (вучэбны дапаможнік). Для падрыхтоўкі да заняткаў студэнты карыстаюцца матэрыяламі, выдадзенымі як у Беларусі (Н.Ю.Бярозкіна), так і ў замежных краінах, у першую чаргу ў Расіі і на Украіне (І.А.Шамракова, Н.Н.Кушнарэнка, Н.Б.Зіноўева). Але яны не ў поўнай меры адпавядаюць сучасным патрабаванням да будучага спецыяліста, таму на кафедры запланавана выданне вучэбнага дапаможніка “Гісторыя кнігі”. Вучэбна-метадычныя матэрыялы па курсах “Дакументалогія” і “Гісторыя кнігі” распрацоўваюцца з улікам палажэнняў Адукацыйнага стандарта, абапіраюцца на дзеючы вучэбны план і адлюстроўваюць усе змяненні ў тэорыі і гісторыі дакументных камунікацый і педагагічнай навукі.

Дысцыпліны “Дакументалогія” і “Гісторыя кнігі” выкладаюцца на першым курсе. Гэта ўлічваюць выкладчыкі ў працэсе навучання. Выбар дыдактычнага інструментарыя залежыць ад узроўню сацыялізацыі асобы студэнта-першакурсніка і ўмоў працэсу выкладання (паточная лекцыя, семінарскія ці практычныя заняткі, лекцыя-экскурсія і інш.). З мэтай метадычнай дапамогі студэнтам у самакантролі ўзроўню засваення ведаў па курсах “Дакументалогія” і “Гісторыя кнігі” распрацавана сістэма бягучага (па асобных тэмах) і выніковага рэйтынгавага кантролю ведаў у выглядзе тэстаў, прадугледжана выкарыстанне гульнявых і актыўных формаў правядзення заняткаў, напрыклад семінар “Дзяжурны дацэнт”, семінар-дыспут, графічнае ілюстраванне тэарэтычных пытанняў.

Для атрымання станоўчага эфекту навучання і павышэння якасці засваення вучэбнага матэрыялу вялікае значэнне мае выкарыстанне ўсёй разнастайнасці дакументаў, якія ёсць у бібліятэках. Таму практычныя заняткі па курсе “Дакументалогія”, прысвечаныя знаёмству з рознымі групамі дакументаў, павінны быць аснашчаны адпаведнымі дакументнымі рэсурсамі. Як правіла, фарміраваннем такога фонду займаецца кожная кафедра асобна, гэта не зусім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зручна для стварэння ўмоў, неабходных для правядзення практычных заняткаў.

Пастаянны аналіз водгукаў выкладчыкаў і студэнтаў – гэта адна з важкіх крыніц удасканалення вучэбна-метадычнага працэсу, што садзейнічае ўстанаўленню зваротнай сувязі, якая дазваляе скарэкціраваць методыку выкладання, ацаніць з пункту гледжання студэнта метадычную аснашчанасць вучэбнага працэсу, убачыць адсутныя ў ім звёны. Па гэтай прычыне пасля вывучэння курсаў "Дакументалогія" і "Гісторыя кнігі" было праведзена анкетаванне студэнтаў дзённай формы навучання, у якім прынялі ўдзел 90 чалавек, што складае 70% ад усіх студэнтаў, якія вывучалі названыя дысцыпліны. Пры адказе на пытанне: "Якімі вучэбна-метадычнымі матэрыяламі Вы карыстаецеся больш за ўсё?" – было адзначана, што 72% студэнтаў карыстаюцца электроннымі тэкстамі лекцый выкладчыкаў кафедры, 45% – падручнікамі, 37% – ВМК, 7–12% выкарыстоўваюць выдадзеныя раней метадычныя рэкамендацыі. Акрамя таго, студэнты выкарыстоўваюць вучэбна-метадычныя выданні замежных аўтараў, рэсурсы Інтэрнета, хаця і не так часта (50%). Сярод прычын, якія зніжаюць эфектыўнае выкарыстанне вучэбна-метадычных матэрыялаў, называюцца недастатковая іх колькасць у бібліятэцы (65% апытаных) і недахоп часу на працу з імі (32% апытаных). Каля 5% студэнтаў адзначылі, што не маюць патрэбы звяртацца да вучэбна-метадычных матэрыялаў. Гэта паказвае, што студэнты-першакурснікі яшчэ не навучыліся вучыцца эфектыўна. Сярод прапаноў па ўдасканаленні вучэбна-метадычнага суправаджэння выкладання курсаў "Дакументалогія" і "Гісторыя кнігі" імі называюцца выданне падручнікаў, размяшчэнне ў электроннай бібліятэцы тэкстаў лекцый, падрыхтоўка прэзентацый па большасці тэм дадзеных дысцыплін, павелічэнне колькасці падручнікаў у бібліятэцы. Такім чынам, з мэтай паляпшэння навукова-метадычнага і інфармацыйнага забеспячэння выкладання курсаў "Дакументалогія" і "Гісторыя кнігі" неабходна цеснае ўзаемадзеянне з бібліятэкай універсітэта па забеспячэнні выкладання дысцыплін. У перспектыве з улікам дзеяння новага вучэбнага плана і праграм ВМК павінен будавацца з улікам кампетэнтнаснага падыходу, калі засваенне кожнага модуля курса арыентуецца на фарміраванне прафесійнай, акадэмічнай, сацыяльна-асобаснай кампетэнцыі. Магчыма яго дапаўненне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даведачнымі дакументамі (гласарыем, электроннымі базамі першакрыніц), якія адпавядаюць алгарытму навучання. Карысным будзе забеспячэнне доступу да вучэбна-метадычных матэрыялаў, якія прайшлі рэдакцыйна-выдавецкую апрацоўку, праз Інтэрнет.


1. *Гребенюк, В.П.* ВУЗ как образовательная система: разработка системы обеспечения высокого качества подготовки современного специалиста / В.П.Гребенюк // Проблемы современной экономики: евразийский междунар. науч.-аналитич. журнал. – 2009. – №1(21). – С. 3–10.

2. *Гусаковский, М.А.* Инновационное образование и практическое знание в университете / М.А.Гусаковский // Инновации и подготовка научных кадров высшей квалификации в Республике Беларусь и за рубежом / под ред. И.В.Войтова. – Режим доступа : http:// belisa.org.by/


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ